Источник: "Наша слова" - 2012-07-18

# ГЕОРГІЮ ШТЫХАВУ - 85

**Георгій Васілевіч ШТЫХАЎ** (14 ліпеня 1927, в. Старая Беліца Гомельскага раёна), беларускі археолаг і гісторык. Доктар гістарычных навук (1983), прафесар (1989).

Нарадзіўся ў сям'і службоўцаў. Працаваў настаўнікам у школах Гарадзенскай і Гомельскай абл. (1950-1959). Скончыў гістарычны факультэт БДУ (1956). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1959-1962), на фармаванне гістарычнага светапогляду Г. Штыхава значна паўплывалі У.М. Ігнатоўскі і А.Р. Мітрафанаў. Малодшы навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык сектара, загадчык аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі Інстытута гісторыі АН БССР (1962-2000). У 1965 абараніў кандыдацкую дысертацыю "Древний Полоцк (IX-XIII вв.)" (навук. кіраўн. - В.Р. Тарасенка). З 1982 ўзначальвае пастаянную камісію па археалагічным даследаванні старажытнага Менска. У 1983 абараніў доктарскую дысертацыю "Города Полоцкой земли (IX-XIII вв.)". Прафесар (1987). З 2000 - галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэднявечнага перыяду Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Навуковыя зацікаўленні: археалогія і гісторыя Беларусі VI-XIII ст., гісторыя і археалогія Полацкай зямлі, вытокі беларускай народнасці. Вывучае гарады Полацкай зямлі і курганныя могільнікі ранняга сярэднявечча паўночнай і цэнтральнай Беларусі. Кіраваў экспедыцыямі па вывучэнні Полацка, Заслаўя, Віцебска, Барысава, Лукомля, Лагойска, Копысі. Падрыхтаваў 2 доктараў і 19 кандыдатаў навук. Узначальваў Беларускую асацыяцыю ахвяр палітычных рэпрэсій (1992-1994). Актыўны сябар ТБМ імя Ф. Скарыны.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990).

Аўтар болей за 490 работ. Асноўныя публікацыі:




“Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі”. - Мн., 1992;

“Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі” - Мн., 1999;

“Галасы далёкіх прод-каў”. - Мн., 1968.;

“Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў да канца XIII ст.”. Вучэб. дапам. - Мн., 1994;

“Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі”: Мн., 1996;

“Мінск - сталіца ўдзельнага княства Полацкай зямлі” // Гісторыя Мінска. - Мн., 2006 і інш.